УДК 339.986“652”

**В. А. Астрога**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ВОЙНЫ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ

У артыкуле на асобных прыкладах з гісторыі Старажытнай Грэцыі і Рыма (Мегарская псефізма, сітуацыя вакол астравоў Радос і Дэлас) аналізуецца праблема выкарыстання эканамічных сродкаў вядзення ваенных дзеянняў у Старажытным Свеце. Падкрэслена, што ў Старажытны перыяд асобныя ваенныя кампаніі распрацоўваліся ў спалучэнні неваенных эканамічных і ваенных метадаў. Гэта часта прыводзіла да хутчэйшай і спусташальнай перамогі над супраціўнікам. Пазначана, што мадэлі эканамічнай вайны альбо яе элементы актыўна выкарыстоўваліся ў разглядаемы перыяд. Робіцца выснова, што гістарычны досвед прымянення эканамічных метадаў вядзення ваенных дзеянняў актыўна і шырока выкарыстоўваецца і сёння, што патрабуе ад сучаснай дзяржавы мацаваць эканамічную бяспеку як падмурак агульнай абароназдольнасці і бяспекі.

**Ключавыя словы:** знешні гандаль, эканоміка, вайна, ваенная стратэгія, Старажытная Грэцыя, Старажытны Рым.

**V. A. Astroha**
Belarusian state university

# ECONOMIC WARS IN ANCIENT TIMES

The article analyzes the problem of using economic means of warfare in the Ancient world using a separate examples from the history of Ancient Greece and Rome (Megarian psephism, the situation around the Islands of Rhodes and Delos). It is emphasized that in the ancient period, a separate military campaigns were developed in a combination of non-military economic and military methods. This often led to a quick and devastating victory over the enemy. It is indicated that models of economic war or its elements were actively used in the period under review. It is concluded that the historical experience of using economic methods of warfare is actively and widely used today, which requires the modern state to strengthen economic security as the Foundation of General defense and security.

**Key words:** foreign trade, economy, war, military strategy, Ancient Greece, Ancient Rome.

**Уводзіны.** На жаль, войны з’яўляюцца сталым спадарожнікам чалавецтва. За сваю гісторыю чалавецтва, паводле меркаванняў экспертаў, удзельнічала ў больш за 15 тыс. войнах. Падлічана, што за апошнія болей чым 5 тыс. гадоў людзі здолелі пражыць у міры ўсяго толькі 300 гадоў, гэта значыць, у кожным стагоддзі яны жылі мірна толькі тыдзень [1]. Калі азірнуцца на пачатак чалавечай цывілізацыі і паспрабаваць растлумачыць прычыны войнаў у старажытныя часы, то, канешне, галоўныя з іх – гэта змаганне за матэрыяльныя рэсурсы: зямлю альбо тэрыторыі, рабоў ці сялян, маёмасць, каштоўнасці і ўладу. Аднак, аналізуючы войны гэтага перыяду, сярод традыцыйных мы можам назіраць у іх і такія элементы стратэгій, якія вельмі нагадваюць сучасныя «эканамічныя войны». У выніку гэты час, без сумнення, можна разглядаць як першыя крокі ў стварэнні сусветнага досведу эканамічных метадаў вядзення ваенных дзеянняў, якія з ХХ ст. пачалі актыўна выкарыстоўвацца і без якіх сёння фактычна не абыходзіцца ні адна буйная вайсковая кампанія.

**Асноўная частка.** Трэба падкрэсліць, што старажытныя палкаводцы, нават маючы вялікія войскі, актыўна і спрытна выкарыстоўвалі не «баявыя» эканамічныя сродкі вядзення войнаў. Так, македонскі цар Філіп ІІ пад час свайго заваявання грэчаскіх гарадоў (сярэдзіна IV ст.), казаў, што ў самай непрыступнай крэпасці заўсёды адшукаецца калітка, праз якую пройдзе асёл, гружаны золатам [2, с. 29]. У сваю чаргу, знакаміты кітайскі стратэг Сунь Цзы ў трактаце «Мастацтва вайны» (V ст. да н. э.) пісаў, што «вайна – гэта шлях падману» і таму раіў супраціўніка «прывабіць выгадай; прывядзі яго ў засмучэнне і бяры яго». Больш таго, ён лічыў, што «па правілах вядзення вайны найлепшае – захаваць дзяржаву супраціўніка ў цэласці, на другім месцы – разбурыць гэтую дзяржаву ... Таму сто разоў змагацца і сто разоў перамагчы – гэта не лепшае з лепшага; лепшае з лепшага – скарыць чужое войска, не змагаючыся». «Таму той, – працягваў Сунь Цзы, – хто ўмее весці вайну, пакорыць чужое войска, не змагаючыся; бярэ чужыя крэпасці, не абложваючы; бурыць чужую дзяржаву, не трымаючы сваё войска доўга ... таму і можна не прытупляючы зброю мець выгаду: гэта і ёсць правілы стратэгічнага нападу» [3].

Яскравыя ілюстрацыі асаблівасцей міждзяржаўных эканамічных канфліктаў Старажытнага Свету нам дэманструе найперш старажытнагрэцкая і старажытнарымская гісторыя.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў, які магчыма экстрапаліяваць на сучасныя рэаліі, можа быць Мегарская псефізма. У V ст. да н. э. большасць тэрыторыі Грэцыі была падзелена паміж двума моцнымі саюзамі дзяржаў-полісаў – дэмакратычным Афінскім марскім саюзам і арыстакратычнай Пелапанэскай Лігай. Адной з прычын іх супрацьстаяння былі даўнія гандлёва-эканамічныя супярэчнасці паміж Афінамі і вядучым гандлёвым цэнтрам пелапанэсцаў – Карынфам.

У гэтыя часы дастаткова актыўна і паспяхова займаліся гандлем і Мегары. Гэты поліс дзейнічаў па прынцыпу – «сталых саюзнікаў не бывае, сталым бывае толькі прыбытак» і паспеў паваяваць як з Афінамі, так і з Карынфам. Гэта стала бачна, калі пад час кафлікту ў Эпідамне Мегары выйшлі з Афінскага марскога саюзу і падтрымалі Карынф, адначасова працягваючы гандляваць вырабамі свайго рамяства і сельскай гаспадаркі на рынках Афін і яе саюзнікаў. Нейкі час афіняне свядома не звярталі на гэта ўвагі, але ўсё ж хутка вырашылі нанесці ненадзейнаму саюзніку ў адказ нечаканы ўдар эканамічнага характару.

У 432 г. да н. э. адразу пасля завяршэння канфлікту ў Эпідамне ўступіла ў дзеянне псефізма (пастанова), згодна з якой мегарскім гандлярам пад караю смерці забаранялася карыстацца партамі Афінскага марскога саюзу і гандляваць на ягоных кірмашах. Мегары адразу ператварыліся ў найзлоснага ворага Афін [4, с. 197].

Псефізма, як узгадваюць крыніцы, нанесла жосткі ўдар па эканоміцы поліса. Ён фактычна ў адзіны момант згубіў значную колькасць традыцыйных гандлёвых маршрутаў і рынкаў збыту. Больш таго Мегары, не маючы вялікіх плошчаў ворыўных зямель, у значнай ступені страцілі магчымасць імпартаваць зерне, і іх жыхароў чакала пагроза голаду.

Мегарская псефізма як першае ў грэцкай гісторыі эмбарга, як лічаць эксперты, нанесла ўдар не толькі па саміх Мегарах, але і па ўсёй Пелапанэскай Лізе, а таксам і па саюзніках Афін. З гэтага часу ні адзін гандлёвы поліс не мог быць упэйненым, што яго мінуе лёс Мегар. Гэты моцны і жорсткі інструмент эканамічнай вайны стаў шырака вядомым. Але не ўсе афінскія грамадзяне згаджаліся з гэтай мерай. Так, у п’есе Арыстафана «Ахарняне» (425 г. да н. э.) адзін з галоўных герояў землеўладальнік Дзікеапаль запытаў у мегарца, які прывёз на афінскі кірмаш прадаваць дзвюх сваіх малых дачок, – «Як жыццё?» і пачуў ў адказ – «Якое жыццё? Сядзім галодныя» [5].

Працяглыя перамовы аб адмене Мегарскай псефізмы не скончыліся згодай. Гэта разам з іншымі абставінамі стала адной з асноўных прычын амаль трыццацігадовай Пелапанэскай вайны, у якой разам з Саюзам і Лігай прынялі ўдзел Персія, Македонія, Сіцылія і Аргас. А калі ход вайны пачаў складвацца не на карысць Афін, то яе саюзнікі, баючыся паўтору лёсу Мегар, палічылі за лепшае выйсці з саюзу. Такім чынам, выкарыстанне эмбарга Афінамі нечакана ўдарыла праз нейкі час і па іх саміх.

Рым таксама зрабіў свой уклад у гісторыю эканамічных войнаў. Тут трэба ўзгадаць пра яго змаганне з міжземнаморскім вострвам Радос.

У сярэдзіне II ст. да н. э. востраў Радос, які знаходзіўся на скрыжаванні марскіх шляхоў у Міжземным моры, быў адным з галоўных і багацейшых цэнтраў транзітнага гандлю. Маючы добрыя гавані, прыбярэжную і гандлёвую інфраструктуру, ён дазваляў ажыццяўляць буйныя камерцыйныя аперацыі, у тым ліку з Паўночнай Афрыкай і Блізкім Усходам. Згодна з антычнымі крыніцамі, штогадовы гандлёвы абарот Радоса складаў звыш за 50 млн драхм (па некаторых меркаваннях гэта эквівалентна ад 100 да 900 млн дал. ЗША), то адпавядала гадавому бюджэту Рымскай Рэспублікі, а сума гандлёвых мыт дасягала 1 млн драхм [4, с. 332].

Радос меў не толькі дасведчаных гандляроў, але і вельмі моцны ваенны флот, які жорстка змагаўся з піратамі. Праводзячы прарымскую палітыку, пад час вайны Рыма з сірыйскім царом Антыёхам III Вялікім радосцы аказалі рымлянам дапамогу ў крытычны для іх час: знішчылі ў марской бітве ля мыса Міёнес у 190 г. флот сірыйцаў, што дапамагло Рыму разбіць ворага на сушы.

Але ўжо праз некалькі дзесяцігоддзяў недастаткова лаяльны, на погляд рымлян, Радос пачаў замінаць моцы Рыма, які да таго ж актыўна пашыраў свае ўладанні за кошт элінскіх зямель. Акрамя таго, рымскім купцам для гандлю ў Міжземнаморскім рэгіёне ўжо былі не патрэбныя пасярэднікі з Радосу. Але магутны радоскі флот пакуль не дазваляў рымлянам рэалізаваць свае экспансійныя планы і вырашыць праблему ў адкрытым баі. Вайна з былым саюзнікам магла неспрыяльна адбіцца на іміджы Рымскай Рэспублікі. Самі радосцы бачылі агрэсіўныя памкненні Рыма і пачалі праводзіць больш незалежную палітыку і падрымліваць супраціўнікаў Рыма, што станавілася ўсё больш небяспечным. Тады Рым вырашыў нанесці нябачны ўдар і разбурыць галоўную крыніцу моцы Радоса – транзітны гандаль.

З гэтай мэтай у 166 г. да н. э. рымляне замацавалі за маленькім вострвам Дэлас статус вольнага марскога парта, дзе ўсялякія гандлёвыя

аперацыі вызваляліся ад партовага мыта і іншых збораў. Раней востраў быў знакаміты для ўсяго элінскага свету толькі як святая зямля Апалона, у храм якога накіроўвалі свае стопы шматлікія паломнікі. Востраў фактычна стаў першай у Еўропе аўшорнай зонай. Праз некалькі гадоў міжземнаморскія гандлёвыя шляхі сканцэнтраваліся на Дэласе. Як пісаў пра востраў антычны гісторык і географ Страбон: «Ягоная слава ўзрасла яшчэ больш. Бо купцы, якія вялі заморскі гандаль, накіроўваліся на Дэлас, так як іх туды вольнасць ад налогаў і мыт, і зручнасць ганяняў» [6].

На востраве мясціліся шмат кварталаў («брацтваў»), у якіх жылі розныя замежныя купцы з Егіпта, Палестыны, Аравіі, Фінікіі, Італіі і іншых краін. Дзякуючы гэтаму, рымскія купцы атрымалі магчымасць непасрэдна гандляваць з Усходам. Дэлас стаў неафіцыйнай сталіцай міжнароднага гандлю рабамі ўсходняга Міжземнамор'я, якіх у асноўным пастаўлялі піраты. У выніку ягоны эканамічны супернік Радос, хаця і не быў знішчаны, але ператварыўся з прывабнага глабальнага гандлёвага асяродка ў адну з рэгіянальных гандлёвых дзяржаў і згубіў свой вялізны ўплыў, што зрабіла яго значна больш кволым перад Рымам, чаго той і імкнуўся дасягнуць. Так, у першы год існавання новага Дэласа мытныя даходы Радоса знізіліся з 1 млн да 150 тыс. драхм. Пасля гэтага ўдара радосцы ўзняцца ўжо не далі рады. У гістарыяграфіі склалася меркаванне, што гэта стала «сапраўднай катастрофай для радоскага гандлю» [7, с. 279].

Але імклівае разбагацеўшы на фінансавых аперацыях і гандлю рабамі Дэлас не меў доўгай славы. У 88 г. да н. э. панційскі цар Мітрыдат VI, які ваяваў супраць Рыма, разбурыў квітнеючы востраў, а ўсе яго 20 тыс. жыхароў былі забітыя альбо прададзены ў рабства [6].

Менш чым праз 20 гадоў, у 69 г. да н. э. на востраў напалі міжземнаморскія піраты і разрабавалі яго. Рым не здолеў абараніць сваю крэатуру. У сваю чаргу, недзе праз 20 гадоў, прыйшоў у заняпад і Радос. У 44 г. да н. э. рымскія войскі разбілі значную частку яго флоту і спустошылі востраў. З цягам часу, калі ў 30 г. да н. э. Егіпет трапіў пад уладу Рыма, цэнтрам міжземнаморскага гандлю стала новая зорка – Адександрыя.

**Заключэнне.** Такім чынам, войны старажытнага свету дазваляюць нам зрабіць выснову аб тым, што сярод іх прычын часта былі і эканамічныя. У гэты перыяд асобныя ваенныя кампаніі распрацоўваліся з улікам знішчэння альбо значнага змяншэння моцы супраціўніка. Гэта прыводзіла да паступовага пашырэння выкарыстання так званай «мяккай моцы» ў перыяд перад непасрэдна ваенным нападам. Часта спалучэнне неваенных эканамічных і ваенных метадаў прыводзіла да хутчэйшай і спусташальнай перамогі над супраціўнікам.

Пэўныя аналогіі і падабенства войнаў старажытнага часу і сучасных ваенных кампаній дазваляе зрабіць выснову, што досвед выкарыстання эканамічных метадаў вядзення ваенных дзеянняў актыўна і шырока выкарыстоўваецца і сёння. Кіраўніцтва сучаснай дзяржавы, каб лічыць яе цалкам абароназдольнай, мусіць не толькі ўзбройваць і навучаць сваё войска, але найперш развіваць устойлівую для падобных вонкавых крызісаў і шокаў эканоміку, рабіць яе шматгаліновай, дыверсіфікаванай. Гэта дазволіць аднaчасова ўмацаваць эканамічную бяспеку як падмурак агульнай абароназдольнасці і бяспекі краіны.

## Літаратура


1. Сколько войн прошло за всю историю человечества. URL: https://yorick.kz/skolko-vojn-proshlo-za-vsyu-istoriyu-chelovechestva (дата обращения: 20.02.2020).
2. Мерников А. Г., Спектор А. А. История войн от древнего мира до наших дней. Минск: Харвест, 2007. 640 с.
3. Искусство войны Сунь-цзы и текст. URL: https://www.bookol.ru/starinnoe/drevnevostochnaya_literatura (дата обращения: 22.02.2020).
4. История Древней Греции / под. ред. В. И. Кузищина. М.: Высш. шк. 1996. 399 с.
5. Головня В. В. История античного театра. «Ахарняне». URL: http://antique-lit.niv.ru/antique-lit/golovnya-antichnyj – teatr/aharnyane.htm (дата обращения: 20.02.2020).
6. Дергачев. В. Делос. Сингапур античного мира. Первая в Европе зона свободной торговли. URL: https://dergachev-va.livejournal.com/104600.html (дата обращения: 20.02.2020).
7. Ковалев С. И. История Рима. Ленинград: Изд-во Лениградского университета, 1986. 744 с.


## References


1. *Skol'ko voyn proshlo za vsyu istoriyu chelovechestva* [How many wars have passed in the history of mankind]. Available at: https://yorick.kz/skolko-vojn-proshlo-za-vsyu-istoriyu-chelovechestva (accessed 20.02.2020).
2. Mernikov A. G., Spektor A. A. *Istoriya voyn ot drevnego mira do nashikh dney* [History of wars from the ancient world to the present day]. Minsk, Kharvest Publ., 2007. 640 p.

3. *Iskusstvo voyny Sun'-tszy i tekst* [Sun Tzu's art of war and text]. Available at: https:// www.bookol.ru/starinnoe/drevnevostochnaya_literatura (accessed 20.02.2020).

4. Kuzishchina V. I. *Istoriya Drevney Gretsii* [History Of Ancient Greece]. Moscow, Vysshaya shkola Publ., 1996. 399 p.

5. Golovnya V. V. *Istoriya antichnogo teatra. "Akharnyane"* [History of the ancient theater. "Ahardane"]. Available at: https:// antique-lit.niv.ru/antique-lit/golovnya-antichnyj – teatr/aharnyane.htm (accessed 20.02.2020).

6. Dergachev V. *Delos. Singapur antichnogo mira. Pervaya v Evrope zona svobodnoy torgovli* [Delos. Singapore of the ancient world. Europe's first free trade zone]. Available at: https:// dergachev-va.livejournal.com/104600.html (accessed 20.02.2020).

7. Kovalev S. I. *Istoriya Rima* [History of Rome]. Leningrad, Izd-vo Lenigradskogo universiteta Publ., 1986. 744 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Віктар Аляксандравіч** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Минск, пр. Независимости, 4, Республика Беларусь). E-mail: ostroga.v@mail.ru

## Information about the author

**Astroga Victor Aleksandrovich** – DSc (History), Professor, Head of the Department of Customs Affairs. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga.v@mail.ru

*Пастуніў 13.03.2020*